УДК 37(476)(091) «18»

**В. Г. Ліпская**
Магістрант кафедры педагогікі і псіхалогіі, УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна», г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік: Болбас Валерый Сяргеевіч, доктар педагагічных навук, прафесар

# ЭТЫКА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

*У артыкуле разглядаецца этыка-педагагічная думка Беларусі першай паловы XIX ст., на фарміраванне якой вызначальны ўплыў аказалі ідэі прадстаўнікоў філасофскай думкі эпохі Асветніцтва. Адзначаецца, што ў цэнтры ўвагі этыка-педагагічнай думкі Беларусі дадзенага перыяду знаходзіцца праблема выхавання чалавека, здольнага садзейнічаць удасканаленню грамадства і духоўнаму, маральнаму прагрэсу ўсяго чалавецтва. Падкрэсліваецца, што ў этыка-педагагічных поглядах асветнікаў таго часу маральны ідэал чалавека набывае новыя рысы – высокаадукаванага, высокамаральнага, працавітай асобы, грамадзяніна, патрыёта, які садзейнічае сваёй дзейнасцю развіццю грамадства і дзяржавы.*

*Ключавыя словы: этыка-педагагічная думка, свабода, філаматы, Асветніцтва, грамадзянін, праца, шчасце.*

**Уводзіны**

Першая палова XIX ст. у вывучэнні этыка-педагагічнай думкі Беларусі выклікае асаблівую цікавасць у сувязі з неадназначнымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі з'явамі, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на яе развіццё. В. С. Болбас адзначае: "Працэс развіцця этыка-педагагічнай думкі трэба разглядаць на аснове інтэграцыі адпаведнай сукупнасці не толькі этычных і педагагічных, але і гістарычных ведаў" [1, с. 19]. Таму аналіз этыка-педагагічнай думкі дадзенага перыяду немагчыма ўявіць па-за яе сувяззю з тэндэнцыямі развіцця грамадска-палітычнай і філасофскай думкі папярэдняга XVIII ст., якое атрымала ў гісторыі чалавецтва назву эпоха Асветніцтва. Першая палова XIX ст. стала пачаткам карэннага пераўтварэння духоўнай культуры ў гісторыі беларускіх зямель пад уплывам ідэй не толькі прадстаўнікоў французскага Асветніцтва, але і творчасці прагрэсіўных беларускіх мысліцелей. Прадстаўнікі айчыннай грамадскай думкі гэтага перыяду вялікае значэнне надавалі выхаванню, імкнуліся да пераўтварэння і ўдасканалення грамадства на аснове апошніх дасягненняў навуковай і педагагічнай думкі.

Аналіз літаратурных крыніц паказаў, што дадзенай праблематыцы прысвечаны навуковыя працы многіх беларускіх навукоўцаў (М. М. Мохнач, Э. К. Дарашэвіч, А. С. Майхровіч і інш.), але глыбокіх гісторыка-педагагічных даследаванняў, якія прадугледжваюць усебаковы аналіз этыка-педагагічных ідэй, не праводзілася. У сувязі з гэтым мэта артыкула – раскрыць характэрныя асаблівасці развіцця этыка-педагагічнай думкі Беларусі ў першай палове XIX ст.

**Метады і металалогія даследавання.** Матэрыяламі для напісання артыкула сталі творы прадстаўнікоў педагагічнай думкі Беларусі вызначанага перыяду, аналітычныя працы сучасных навукоўцаў, навуковая літаратура па тэме даследавання. У дадзеным артыкуле, з апорай на культуралагічны падыход, былі выкарыстаны наступныя метады даследавання: гістарычны метад, тэарэтычны аналіз літаратурных крыніц, абагульненне.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне**

Беларускія землі ў першай палове XIX ст. знаходзіліся ў стане сацыяльна-эканамічнага крызісу. Паказчыкамі крызісу былі нарастанне сацыяльнага напружання і рост сялянскага руху. Асноўныя формы феадальнага гаспадарання знаходзіліся на стадыі распаду, сацыяльнае жыццё характарызавалася ростам пратэстаў супраць існуючай рэчаіснасці. У грамадскай думцы ўсё больш укараняліся ўяўленні аб тым, што пануючая сацыяльна-эканамічная іерархічнасць соцыума з'яўляецца варожай самой прыродзе чалавека. Асветнікі актыўна крытыкавалі сучаснае ім феадальнае грамадства, выступалі за фарміраванне новых грамадскіх адносін, свабоду чалавека, імкнуліся да выкрыцця існуючых забабонаў і стэрэатыпаў, якія стрымліваюць, на іх думку, развіццё чалавека і прагрэс грамадства.

© Ліпская В. Г., 2021

МГПУ им. И.П.Шамякина

Фарміраванне этыка-педагагічнай думкі Беларусі ў першай палове XIX ст. было непарыўна звязана з тэндэнцыямі развіцця грамадска-палітычнай і філасофскай думкі папярэдняга стагоддзя. Прадстаўнікі ўзніклага яшчэ ў другой палове XVIII ст. руху, звязанага з прапагандай ідэй Асветніцтва, абгрунтоўвалі сістэму каштоўнасцяў, заснаваную на ўсебаковым разняволенні чалавека і магчымасці прагрэсу чалавецтва, сцвярджалі культ розуму, бачылі ў ведах магчымасць вырашэння ўсіх сацыяльных праблем. Уяўленням пра чалавека, якія былі сфарміраваны феадальна-саслоўнай ідэалогіяй, супрацьпастаўлялася вучэнне аб чалавеку, вольным ад знешніх кайданоў, незалежным ад усякага аўтарытэту, здольным да самастойных рашэнняў і дзеянняў. Падвяргаліся крытыцы тыя ацэнкі чалавека, згодна з якімі аб высакароднасці яго характару меркавалі па саслоўна-маёмасным становішчы або ўменні назапашваць багацце. Актыўна распаўсюджваліся асветніцкія ідэі, заснаваныя на перакананні ў тым, што годнасць чалавека павінна вызначацца ведамі, а не паходжаннем; развіццё грамадства і дзяржавы, а таксама дабрабыт грамадзян залежаць ад адукацыі.

Актыўнае распаўсюджванне ідэй прадстаўнікоў філасофскай думкі эпохі Асветніцтва садзейнічала фарміраванню ў этыка-педагагічных поглядах айчынных асветнікаў новага вобраза чалавека – грамадзяніна, карыснага грамадству і дзяржаве, асобы свецкай, практычнай і разумнай. Разумнасць, а другімі словамі адукаванасць, знаходзіць сваё ўвасабленне ні ў чым іншым як у маральнасці чалавека, бо няма ніякага сэнсу ў атрыманні ведаў і адукацыі, калі яны не садзейнічаюць удасканаленню маральнай прыроды чалавека. Многія айчынныя мысліцелі падзялялі ідэю Сакрата, што агульнай асновай усіх дабрачыннасцей з'яўляюцца веды. З пункту гледжання асветнікаў, людзі, авалодаўшы ведамі, зразумеюць сутнасць дабра і зла, а затым будуць карыстацца прынцыпам дабра не толькі ў асабістым, але і ў грамадскім жыцці. Такім чынам, дасягненне сацыяльных мэтаў і прагрэс грамадства залежаць ад узроўню адукаванасці і культуры кожнага прадстаўніка дадзенага грамадства. Таму асветнікі, спадзяваючыся на ўсемагутнасць асветы ў пытанні сацыяльных пераўтварэнняў, галоўную ролю ў гэтым пытанні адводзілі выхаванню, асноўнай задачай якога яны бачылі фарміраванне высокаадукаванага, высокамаральнага, працавітага, фізічна здаровага чалавека, які б садзейнічаў сваёй дзейнасцю развіццю грамадства і дзяржавы.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. на беларускіх землях узмацняецца агульнадэмакратычны рух, імкненне змяніць існуючую форму дзяржаўнай улады, ажыццявіць глыбокія сацыяльныя рэформы. У цэнтры ўвагі ідэолагаў рэвалюцыйна-вызваленчага руху знаходзіліся ідэі, якія былі звязаны з высокай адзнакай чалавечай асобы, абаронай яе свабоды, правоў і годнасці, імкненнем вызваліць чалавека ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Чалавек разумеўся імі, з аднаго боку, як істота, сацыяльна-палітычнае становішча і духоўна-маральнае аблічча якой з'яўляюцца адлюстраваннем характэрных асаблівасцяў існуючай рэчаіснасці, а з другога – як галоўная рухаючая сіла пераўтварэння свету [2].

Ужо ў канцы XVIII ст. асаблівую актуальнасць набыла праблема свабоды, якая трактавалася мысліцелямі таго часу не толькі як патрабаванне роўнасці для людзей усіх саслоўяў, іх роўнай магчымасці ўдзельнічаць у грамадскіх і дзяржаўных справах, але і як магчымасць кожнага члена грамадства дзейнічаць на карысць Радзімы. Асветнікі падкрэслівалі, што нельга назваць свабодным той народ, дзе асобны чалавек – нявольнік, нельга назваць шчаслівым народ, калі нешчаслівы асобны прадстаўнік гэтага народа. Яны акцэнтавалі ўвагу на тым, што ва ўмовах прыгону маральнае развіццё асобы не можа працякаць нармальна. Агульнай была ідэя аб тым, што любы від рабства аказвае пагібельнае ўздзеянне не толькі на прыгнечаных, але і на свабодных членаў грамадства. Асветнікі першай паловы XIX ст. бачылі ў сучасным ім свеце панаванне рабства і прыгнёту, карыслівай цікавасці і невуцтва, і кваліфікавалі гэтыя аспекты жыцця як вычварэнства сапраўднай чалавечай сутнасці. Таму найважнейшымі задачамі маральнага выхавання з'яўляліся імкненне адрадзіць гуманныя адносіны і сапраўдную мараль, адкрыць шлях да свабоды. Таксама выказваліся ідэі аб неабходнасці асветы прыгоннага селяніна для таго, каб падрыхтаваць яго да прыняцця сваёй свабоды. З гэтай мэтай меркавалася распаўсюджваць ідэі натуральнага права, ідэі аб прыроджанай свабодзе чалавека як яго сапраўдным чалавечым стане, свабоды як неад'емнай якасці чалавечага быцця.

Прыкметнай з'явай грамадскага жыцця пачатку XIX ст. была дзейнасць таварыства філаматаў, у склад якога ўвайшлі студэнты Віленскага ўніверсітэта – людзі шырока адукаваныя, выхаваныя на традыцыях Асветніцтва, найноўшых дасягненнях навуковай і філасофскай думкі. Я. Чачот, адзін з актыўных прадстаўнікоў таварыства, падкрэсліваў: "Што да адбору членаў, то тут трэба…, каб у таварыства прымаліся толькі сапраўды годныя людзі, дзейныя, з высакародным сэрцам, разумныя, людзі, якія любяць айчыну, старанныя і цвёрдыя…" [3, с. 160]. Задачы таварыства яго ўдзельнікамі ставіліся даволі шырокія: ад неабходнасці падтрымліваць паміж сабой тую атмасферу,

МГПУ им. И.П.Шамякина

якая складае годнасць асвечанага чалавека і імкнення знаходзіць сродкі для ўдасканалення ў навуках і грамадзянскіх цнотах, абуджэння высакародных пачуццяў і дасягнення агульнага шчасця да неабходнасці актыўна працаваць і спасцігаць патрэбы Айчыны [4].

Філаматы лічылі сябе першымі прадстаўнікамі моладзі, якія не прынялі сістэму каштоўнасцяў феадальна-саслоўнага грамадства. У сваёй сацыяльнай канцэпцыі яны зыходзілі з упэўненасці, што настаў час, калі замест невуцтва і забабонаў перамогуць свабода і шчасце. Філаматы крытыкавалі бездухоўнасць сучаснага ім свету, яго мараль, выступалі за тое, каб адносіны паміж людзьмі будаваліся на новых пачатках, імкнуліся да сцвярджэння каштоўнасцяў, якія ўзвышаюць чалавека. Веды разглядаліся філаматамі як найвышэйшая каштоўнасць, вышэйшая карысць для чалавека [5]. Таму асноўнай задачай сваёй дзейнасці яны бачылі асветніцтва: "…пры дапамозе асветы і згуртавання суайчыннікаў яно [таварыства] павінна рабіць дзейсны ўплыў на грамадскую думку, рабіць усё для шчасця і вызвалення айчыны" [3, с. 159]. Разам з асветніцтвам непарыўна звязана і высокая ацэнка працы настаўніка, таму што ўдасканаленне сябе і іншых – гэта крок да ўдасканалення ўсяго грамадства. "Асвета краю, – пісаў Я. Чачот, – найважнейшая спружына яго шчасця. Асвета пашыраецца праз павелічэнне кола тых, хто ўмее чытаць; таму трэба засноўваць школы Ланкастэра, падтрымліваць навуковыя ўстановы, заахвочваць тых, хто пасылае дзяцей і моладзь у школы і ва ўніверсітэт, пашыраць чытанне і друкаванне карысных кніг…, дапамагаць тым, хто хоча вучыцца…" [3, с. 162–163]. Галоўныя задачы школы філаматы бачылі ва ўсебаковым разумовым развіцці вучняў, уменні вызваляцца ад састарэлых поглядаў і мець уласную думку, выхаванні духоўна багатых, высокамаральных грамадзян, якія б выкарыстоўвалі набытыя веды не толькі для асабістых мэтаў, але і для грамадскіх патрэб [6, с. 26–27].

У якасці аднаго з пастулатаў праграмы ўсеагульнай асветы філаматамі абвяшчаўся тэзіс аб неабходнасці авалодання культурнай спадчынай мінулага. У прыватнасці, яны заклікалі спазнаць характар народа, яго звычаі, законы і, грунтуючыся на іх, выпрацаваць уласныя прынцыпы дзейнасці. Філаматы, пранікнуўшыся ўсведамленнем важнасці і неабходнасці вывучэння беларускага фальклору, збіралі легенды, паданні, казкі, вывучалі норавы, звычаі народа, спрабавалі спасцігнуць сутнасць народнага светаўспрымання. Я. Чачот быў упэўнены, што ў простага народа можна шмат чаму навучыцца, калі спазнаць яго становішча і побыт: "Мы знойдзем у іх паданні, казкі, былі, самае багатае будзе жніва песень, якія дадуць магчымасць пазнаць іх тонкія, прыгожыя, нават далікатныя і глыбокія пачуцці" [3, с. 171].

Асаблівая ўвага надавалася пытанням маральнага выхавання моладзі як аб'екта, сутнасць якога ў найбольшай ступені адпавядала б ідэальнай мадэлі чалавека і такім паняццям, як "грамадзянін", "сын Айчыны", "патрыёт". У гэты час сфармавалася паняцце "сапраўднага грамадзяніна", які кіруецца ў сваіх учынках не толькі законамі грамадства, але і законамі сумлення, маралі, рэлігіі. Сапраўдным грамадзянінам, на думку Я. Чачота, з'яўляецца той, хто клапоціцца аб грамадскім дабрабыце, шчасці, асвеце і славе свайго краю, хто гатовы прысвяціць самога сябе, усе свае здольнасці і магчымасці роднай зямлі. З пункту гледжання Ф. Бохвіца, прадстаўніка айчыннай педагагічнай думкі першай паловы XIX ст., "выхаванне павінна фарміраваць маладых людзей для таго, каб у будучыні яны сталі грамадзянамі, здольнымі да розных відаў дзейнасці" [7, с. 170]. Час маладосці філосаф прапаноўваў "прысвяціць вучобе, фарміраванню сябе і падрыхтоўцы да занятку пэўнага месца ў ланцугу карысных грамадскаму арганізму дзей" [7, с. 170], рабіў акцэнт на тым, што "... варта вучыцца таму, што сапраўды развівае нашы веды, што робіць нас карыснымі грамадству на розных пасадах і розных жыццёвых абавязках" [7, с. 171].

Асновай фарміравання сапраўды маральных рыс асобы айчыннымі асветнікамі прызнаваліся праца і дабрачыннасць. Шырокае развіццё атрымала ідэя абавязковасці працы для кожнага члена грамадства, пры гэтым дадзеным паняццям надавалася маральная афарбоўка. Праца – гэта доўг, абавязак, які нясе ў сабе высокі маральны зарад, бо гэта дзейнасць, накіраваная на агульнае дабро, дзейнасць у інтарэсах іншых [2]. На вялікую ролю працы як пераўтваральнай сілы, якая забяспечвае станаўленне чалавека, звяртаў сваю ўвагу філосаф, педагог, прафесар і рэктар Віленскага ўніверсітэта Я. Снядэцкі. Праца, упэўнены ён, з'яўляецца падмуркам асобаснага развіцця і асновай добрага выхавання. Праца на карысць грамадства разглядалася айчыннымі мысліцелямі першай паловы XIX ст. як неад'емны абавязак кожнага яго члена, пры гэтым характару працы не надавалася асаблівага значэння, таму што і фізічная і разумовая праца аднолькава неабходны грамадству.

Шмат увагі ў этыка-педагагічнай думцы першай паловы XIX ст. надавалася праблеме шчасця. Усебаковае гарманічнае развіццё асобы, якое з'яўляецца абавязковай умовай развіцця грамадства, таксама з'яўляецца і абавязковай умовай дасягнення чалавекам асабістага шчасця. Шчасце чалавека

МГПУ им. И.П.Шамякина

звязвалася з тымі яго якасцямі, якія больш за ўсё выяўлялі яго сацыяльную сутнасць, стаўленне да іншых людзей. Падкрэслівалася, што чалавек знаходзіць шчасце не толькі ў матэрыяльным дастатку, адчуванне шчасця яшчэ залежыць ад унутранага задавальнення сваімі справамі і ўчынкамі. Шчасце разумелася як стан узвышанага духоўнага, маральнага перажывання, як пачуццё задавальнення ад прыналежнасці да ажыццяўлення вялікіх мэтаў. Я. Чачот быў перакананы, што асабістае шчасце чалавека трэба шукаць у шчасці грамадства, бо "дбаць пра грамадскае дабро – значыць памнажаць і дабро ўласнае" [3, с. 161].

Разглядаючы праблему чалавека ў плане забеспячэння ўмоў для яго гарманічнага развіцця і шчасця, айчынныя мысліцелі зыходзілі з неабходнасці і магчымасці пазнання матэрыяльнага свету ў яго шматстайных праявах. Заклікаючы вырвацца з цемры няведання, яны імкнуліся распрацаваць праграму комплекснага даследавання прыродна-сацыяльнага асяроддзя як галоўнай умовы жыцця чалавека, фарміравання яго маральнага аблічча [2]. Ф. Бохвіц меркаваў, што са школьнага ўзросту дзецям трэба даваць навуковыя веды аб прыродзе. Асаблівае месца ў вывучэнні прыроды філосаф адводзіў непасрэдным з ёй зносінам і арганізацыі працы дзяцей у прыродным асяроддзі: "Імкнучыся адшукаць прызначэнне і мэту нашага выхавання, мы абавязкова павінны зірнуць на свет, у якім жывем. Бо гэты свет ... змяшчае ўсе папярэднія (станаўленню чалавека) уласцівасці, якія служаць і мэтам нашага існавання, і мэтам нашага выхавання... " [7, с. 169].

Увогуле ў аснове этыка-педагагічнай думкі Беларусі першай паловы XIX ст. знаходзілася праблема выхавання чалавека, здольнага садзейнічаць удасканаленню грамадства і духоўнаму, маральнаму прагрэсу ўсяго чалавецтва У аснове маральнага ідэалу таго часу была ідэя гарманічнага развіцця "прыроды" чалавека, якая ўвасаблялася ў вобразе бескарыслівай, простай, духоўна моцнай, шчырай, гуманнай асобы, чыя дзейнасць накіравана на служэнне агульнаму дабру. Светлая будучыня – гэта перш за ўсё новы чалавек, не толькі больш мудры, але і лепшы з пункту гледжання прынятых каштоўнасцяў. Асветнікамі вылучалася задача ўздзейнічаць не толькі на розум чалавека, але і на волю і пачуцці, паколькі толькі іх адзінства складае цэласную асобу. Вядомы рускі літаратурны крытык і філосаф XIX ст. В. Г. Бялінскі падкрэсліваў: "Без асобы не было б ні пачуццяў, ні розуму, ні волі, ні дабрачыннасці, ні прыгажосці" [8, с. 28]. Таму мэтай маральнага выхавання з'яўлялася фарміраванне такіх пачуццяў, якія забяспечвалі б усталяванне сапраўды чалавечых адносін паміж людзьмі (дружбы, узаемаразумення, узаемадапамогі, спагады). Ідэя гуманнасці разглядалася айчыннымі асветнікамі як сутнасць чалавечага быцця, той натуральны стан, да якога павінен імкнуцца чалавек.

**Заключэнне**

Такім чынам, асветнікамі Беларусі першай паловы XIX ст. была вылучана праграма, якая прадугледжвала фарміраванне навуковага погляду на прыроду з мэтай пазбавіцца ад забабонаў і памылковых меркаванняў адносна з'яў прыроды, прапаганду дасягненняў грамадскіх навук з мэтай даць людзям карысныя звесткі, якія б садзейнічалі магчымасці актыўна выказвацца па сацыяльна-маральных праблемах, у прыватнасці аб неабходнасці асветы, сэнсе і мэтах чалавечага быцця. Вялікая ўвага надавалася пытанням маральнага выхавання грамадства, распрацоўцы палажэнняў, у якіх абгрунтоўваўся высокі маральны ідэал чалавека, характэрнымі прыкметамі якога можна назваць адукаванасць, патрыятызм, свабодную творчую працу ў імя агульнага дабра і інш.

СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ

1. Болбас, В. С. Этико-педагогическая мысль как научный феномен / В. С. Болбас // Педагогика. – 2018. – № 3. – С. 14–24.

2. Мохнач, Н. Н. Общественно-политическая и этическая мысль Белоруссии начала XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск : Наука и техника, 1985. – 94 с.

3. Чачот, Я. Наваградскі замак. Творы / Я. Чачот. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 327 с.

4. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии: доокт. период / АН БССР, Ин-т философии и права ; редкол.: К. П. Буслов (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1977. – 280 с.

5. Мохнач, Н. Н. От Просвещения к революционному демократизму (Общественно-политическая и философская мысль Белоруссии конца 10-х – начала 50-х годов XIX в.) / Н. Н. Мохнач. – Минск : Наука и техника, 1976. – 183 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

6. Болбас, В. С. Маральна-асветніцкія пошукі філаматаў і філарэтаў / В. С. Болбас, І. С. Сычова // Современные подходы к организации педагогической деятельности в условиях высшей школы : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, УО «Мозыр. гос. пед. ун-т» ; редкол.: И. В. Журлова, Т. Н. Савенко, Л. А. Замыко. – Мозырь, 2004. – С. 20–29.

7. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост.: Э. К. Дорошевич, М. С. Мятельский, П. С. Солнцев. – М. : Педагогика, 1986. – 468 с.

8. Белинский, В. Г. Полное собрание сочинений / В. Г. Белинский. – М. : АН СССР, 1953–1956. – Т. 10. Статьи и рецензии 1846–1848. – 1956. – 474 с.

*Паступіў у рэдакцыю 08.10.2021*
E-mail: himmel.01@mail.ru

O. G. Lipskaya

## ETHICS AND PEDAGOGICAL THOUGHT OF BELARUS OF THE FIRST HALF OF THE XIX CENTURY

The article examines the ethical and pedagogical thought of Belarus in the first half of the XIX century, the formation of which was influenced by the ideas of representatives of the philosophical thought of the Enlightenment. It is noted that the focus of the ethical and pedagogical thought of Belarus of this period is the problem of educating a person capable of contributing to the improvement of society and the spiritual and moral progress of all mankind. It is emphasized that in the ethical and pedagogical views of the enlighteners of that time, the moral ideal of a person acquires new features – a highly educated, highly moral, a hardworking person, a citizen, a patriot, contributing to the development of society and the state through his activities.

Keywords: ethical and pedagogical thought, freedom, philomaths, enlightenment, citizen, work, happiness.

МГПУ им. И.П. Шамякина